Газэта рабоча-сялянская моладзі Беларусі

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Аб'яднанай Камуністычнай Моладзі Беларусі

№ 17 (399) Серада, 9 лютага 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню: у серазу, пятніцу і нядзелю | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дня. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дня. Тэл. № 903 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, Чырвоная Зьмена. Менск, Комсам. 25.

Рабоча-сялянская моладзь Савецкай Беларусі--будзь напагатове.

Узмацняй гаспадарчае будаўніцтва. Узмацняй справу абароны і ваенізацыі нашай краіны. Разгортвай культурнае будаўніцтва. Толькі так можна забясьпечыць політыку міру і далейшы ўзрост і ўзмацненьне СССР!

Больш вытрыманасьці, больш творчай працы.

Англія ўзяла курс на вайну. Ёй усе-роўна, з кім ваяваць. Ёй толькі трэба аднавіць свой нарушаны аўторытэт і ўплыў, якіх яна страціла за апошнія гады. Асабліва з часу стварэньня Саюзу Савецкіх Рэспублік.

Саюз Савецкіх Рэспублік, гаспадаром якія зьяўляецца пролетарыят, працоўныя масы, СССР, які вызваліў усіх ня-волькікаў, даў волю усім нацыям, якія знаходзіліся і прыгнечаліся на тэрыторыі былой царскай Расіі,—непасрэдна сва-ім існаваньнем зьяўляецца прыкладам, заклікам да працоўных усяго сьвету, каб яны па нашаму прыкладу скінулі ярмо капіталізму.

Англія ўсе-б нам даравала: усе даўгі, зямельлі, якую мы конфіскавалі, нават больш гэтага: нічо-б пазычыла, каб мы толькі крыху зьмянілі сутнасьць нашае дзяржавы ў больш «дэмократычны» бок: ня, каб і мы прыгнечвалі малыя нацыі каб і мы зьдзекаваліся над пролетарыятам, каб і мы расстрэльвалі і ў астрогі сялян пасадзілі, адным словам, зрабілі-б усе тое, што робіцца на ўсіх буржуазных «дэмократычных і культурных» дзяржавах.

Каб мы гэтак зрабілі, тады-б ніякага абурэньня ня было. Але яны пакуль бачаць, што па нашаму прыкладу англійскі пролетарыят арганізоўвае ўсеагульную забастоўку, яны бачаць, што натхнёныя нашай перамогай, нашым соцыялістычным будаўніцтвам працоўныя масы Кітаю,—рабочая клясa з сялянствам паўсталі супроць сваіх векавых прыгнятальнікаў: за Кітаем паўстаюць галандзкія калоніі, за імі англійскія войскі ў Індыі на вялізным вогнішчы, якое павінна спаліць увесь той лад, які гадамі стварае англійскім кансэрватызмам. Англія пу-дзецца страціць свае калоніі, свае панаваньне.

Прыказка кажа, што чалавек, які тоніцца, нават за саломінку хапаецца. Англійскі урад, вырашаючы пытаньне аб разрыве англа-савецкага дагавору, сам апынуў у гэткае становішча, калі ня ведае, што зрабіць: ці ўхапіцца за саломінку і дайсьці на часовае заміраньне з сваім лютым ворагам, ці падрубіць сук, на якім ён сядзіць зараз і абарваць дыпляматычныя адносіны з СССР. Вось становішча, якое стварылося ў выніку падзей апошняга часу.

Англія трымае курс на разрыў, яна імкнецца цягнуць у свой саюз Францыю-Італію, Германію і перш усяго меншавікоў, якія заўжды гатовы прыслужыцца сваім гаспадаром-хлебадаўцам.

Што высоўваецца ў якасьці асноўных прычын, якія змагаі-б аб'яднаць гэтыя дзяржавы для агульнага выступленьня супроць СССР?

Непасрэдна існаваньне СССР выклікае ў іх найвялікшае абурэньне. Посьпехі нашай соцыялістычнай гаспадаркі—другая прычына. Рабочыя дэлегацыі, якія у нас былі, пераканаліся, што усё, што меншавіцкі і буржуазны друк піша аб нас, гэта ня больш, як маха і плеткі; аб гэтым гавораць нават рабочыя меншавікі, што зразумела выклікае вялікае імкненьне да нас з боку сусьветнага пролетарыяту, а з другога боку нянавісьць з боку фашысцкай буржуазеі,—вось трэцяя прычына. Рабочыя масы ўходзяць з-пад уплыву буржазіі і іх дапаможнікаў меншавікаў, расьце ўплыў комуністычных партый, ідзе зьбіраньне комуністычных сіл,—вось чацьвертая прычына. Бурліць Усход, шматміліённы Кітай крок за крокам завяёўвае правы на самастойнае існаваньне народы Усходы лічаць СССР сваім сябром і абаронцам,—вось пятая прычына, якая разам з вышэйазначанымі складае тую частку прычын, якія кідаюць англійскіх і іншых консэрватараў на разрыў з намі.

Політыка савецкай улады была і будзе політыкай міру. Політыка буржуазеі была і будзе—падрыхтоўка новай вайны, падрыхтаваць узброены напад на нас, а меншавікі дапамагаюць буржуазеі ў ае політыцы.

З адкая на гэта мы павінны ўзмацніць прапаганду міру, але адначасова кожны рабочы і селянін павінен пакласьці ўсе сілы к таму, каб абароназдольнасьць нашай краіны была на належным узьвышшы. Ёсьць у нас яшчэ адна моцная абарона—гэта рабочая клясa ўсяго сьвету.

Пролетарыят усяго сьвету выказвае свае братарскія адносіны да нас. Ён наш верны хаўрусьнік. Англійскі пролетарыят у патрэбны час спыніць усе тыя варожыя мерапрыемствы, якія рыхтуюцца супроць нас. Божны новы посьпех на нашым гаспадарчым фронце яшчэ больш узмацняе бадзёрасьці ў працоўных усяго сьвету, прымушае іх яшчэ больш абараняць СССР ад усякіх нападаў з боку буржуазіі.

Моцная абарона, гаспадарчая моц, хаўрус рабочых усяго сьвету, — вось што ўстрымлівае і будзе ўстрымліваць імпэрыялістаў ад вайны з намі. Рабочыя і сяляне нашае рэспублікі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі ва кожную мебясьпеку адкажуць яшчэ большым згуртаваньнем сваіх шэрагаў, каб любы вораг хламаў сабе шыю аб нашу магутнасьць.

Нас імкнуцца справававаць на вайну. Не падацца на правакацыю, больш вытрыманасьці, творчай працы пад нашай абаронай і будаўніцтвам—нашы задачы ў гэты складаны момант.

Менская організацыя ЛКСМБ.

Да 3-яй конфэрэнцыі.

Менская акруговая організацыя на час 2-й на 3-ю акруговую конфэрэнцыі (сьнежань 25 г.—студзень 1927 г.) вырасла на 2976 чалавек, што складае 35,9 проц.

На 1-е студзеня гэтага году організацыя на стану і соцыяльнаму становішчу прадстаўляе наступны малюнак:

Усяго	Стан. Мужчыны	Жанчыны	Соц. становішча. Рабочых	С.-г. раб. і батр.	Сялян Бедн.	Серад.	Саматн.	Іншыя
8286	6377	1909	3444	667	2301	906	151	817

Акрамя гэтага маецца 957 чалавек кандыдатаў у сябры ЛКСМБ, такім чынам, організацыя налічвае усяго 9243 чалавек.

Прагледзіўшы гэту табліцу і прыраўнаўшы яе з лічбамі складу організацыі на 1-е сьнежня 25 году (2-я конфэрэнцыя) можна зрабіць наступныя грунтоўныя выводы:

— Павялічэньне далучэньня ў організацыі на 3,8 проц., але ўсё-ж налічча іх у колькасьці 33,3 проц. трэба лічыць не задавальняючым і працу па ўцягненьні далучэньня у комсамол, асабліва сельска-гаспадарчых работніц і батрачак, а таксама сялянак, падыходзячых да саюзу на соцыяльнаму становішчу, трэба ўзмацніць.

Рабочы васкроўе у організацыі, на гледзячы на вялікі рост за лік сялянскай моладзі, ня толькі захаваўся, але і павялічыўся на 0,6 проц., што сьведчыць за сыстэматычную працу па выпаўненьні дэзунгу «100 проц. рабочай моладзі ў комсамол», аднак, адсутнічаньне вучоту рабочай моладзі не дазваляе судзіць аб ступені выпаўненьня гэтага дэзунгу.

У росьце за лік батрацтва і сельска-гаспадарчых рабочых у абсолютных лічбах, зразумела, ёсьць павялічэньне, але дзякуючы павялічэньню процанту рабочых і вялікаму росту за лік сялян бяднякоў, процант батрацтва і сельска-гаспадарчых рабочых зьменшыўся на 0,9 проц.

Акруговая конфэрэнцыя павінна даць дырэктыву аб узмацненьні працы па ўцягненьню іх у шэрагі комсамолу.

(Працяг у чарговым нумары).

Прэч драпежны фашызм Пілсудчыны!

(Рэзолюцыя групавога сходу комсамольцаў Ляхаўскага раёну).

Мы комсамольцы—рабочыя, служачыя Расьце новае пакаленьне рабоча-сялянскай моладзі Ляхаўскага раёну моладзі, пачуўшы заслухаўшы даклад аб тэроры польскага фашызму над рабочымі і сялянамі Заходняй Беларусі, шлем свае братарскае прывітаньне рабочым і сялянам Заходняй Беларусі і усей рабоча сялянскай моладзі, якія вядуць барацьбу з крывавым-белым арлом фашызму.

Польскі пан і польскі буржуй з благаславеньнем каталіцкага крыжа і соцыял-згоднікаў у дзікай злосьці супроць «халопскай» революцыі, бізуном, штыхом і кулямётам супакойваюць рабочых і сялян, якія вядуць барацьбу за права быць вольнымі ад панаў.

За сьпіной фашысцкай разьюшанай шайкі Пілсудзкага, відна поўная злосьці морда англійскага банкіра, якая падштурхвае на новую авантуру супроць СССР. Утаніць у крывавым моры вызваленчы рух у Заходняй Беларусі дзеля таго, каб потым накіраваць легіёны Пілсудзкага на СССР—такі вымысел англійскай і польскай буржуазіі.

Але ня будзе гэтага. Крывавая вясьнь ае буржуазіі канчацца не-ж пагібелью. Узмацняецца растучы вал революцыйнага руху, узмацняюцца шэрагі пролетарыяту і сялянства у барацьбе з імпэрыялізмам.

Комсамольцы і беспартыйная моладзь Гарадзкога раёну г. Менску выслухаўшы даклад аб становішчы ў Польшчы і Заходняй Беларусі, канстатуе разгул польскага фашызму з мэтаю разгрому нацыянальна-революцыйнага руху рабочых і сялян Заходняй Беларусі.

Політыка Пілсудскага, фашысцкі пераварот у Літве і спроба фашыскага перавароту ў Латвіі аснованы на політыцы англійскага імпэрыялізму і вызначаюць небясьпеку новай бойкі з мэтай разгрому адзінай краіны саветаў, якая будуе соцыялістычную гаспадарку—СССР.

Нацыянальна-рэволюцыйны вызваленчы рух Заходняй Беларусі і Украіны перашкаджаюць вымыслам англійскага імпэрыялізму, які пра фашысцкіх катаў Польшчы і другіх абкружаючых СССР дробных дзяржаў, імкнецца разбурыць Савецкі Саюз. Пілсудскі ўзяўся за ажыцьцяўленьне загаду консэрватыўнага ўраду Англійчыны і хоча разграміць беларускую рабоча-сялянскую Грамаду.

Але ня будзе гэтага!

Няхай ведае сусьветны фашызм, што мы рабочая моладзь наперашаму сыгналу пролетарскай дзяржавы СССР пойдзем, як адзін у шэрагі рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі, каб адбіць усякія спробы міжнароднага імпэрыялізму, і пашкодзіць мірнаму будаўніцтву соцыялізму ў нашай краіне.

Для гэтага нам комсамольцам і беспартыйнай рабочай моладзі необходна больш узмацніць нашу сувязь з Чырвонай Арміяй, узмацніць вывучаньне вайсковай справы, стаць першымі застрэльшчыкамі ваенізацыі насельніцтва і пашырыць шэрагі Таварыства Садзейнічаньня Абароне Авіяхім.

Мы выносім з абурэньнем свой гучны протест супроць ладжкаў разгулу польскага фашызму над рабочымі і сялянамі Заходняй Беларусі, якія ператварыліся ў турму. Мы шлем свае гарачае прывітаньне вязьням польскіх турм, рабочым і сялянам і рабоча-сялянскай моладзі Заходняй Беларусі. Выказваем нашу падрыхтаванасьць дапамагаць ім матар'яльна і марыльна шляхам збору сродкаў і узмацненьнем шэрагаў МОПР'у

Прэч польскі фашызм, які кіруецца англійскім імпэрыялізмам!

Няхай жыве вызваленча-рэволюцыйны рух Заходняй Беларусі!

Гарачае прывітаньне вязьням польскіх турам.

(Рэзолюцыя групавога сходу рабочай моладзі Гарадзкога раёну г. Менску).

Комсамольцы і беспартыйная моладзь Гарадзкога раёну г. Менску выслухаўшы даклад аб становішчы ў Польшчы і Заходняй Беларусі, канстатуе разгул польскага фашызму з мэтаю разгрому нацыянальна-революцыйнага руху рабочых і сялян Заходняй Беларусі.

Політыка Пілсудскага, фашысцкі пераварот у Літве і спроба фашыскага перавароту ў Латвіі аснованы на політыцы англійскага імпэрыялізму і вызначаюць небясьпеку новай бойкі з мэтай разгрому адзінай краіны саветаў, якая будуе соцыялістычную гаспадарку—СССР.

Нацыянальна-рэволюцыйны вызваленчы рух Заходняй Беларусі і Украіны перашкаджаюць вымыслам англійскага імпэрыялізму, які пра фашысцкіх катаў Польшчы і другіх абкружаючых СССР дробных дзяржаў, імкнецца разбурыць Савецкі Саюз. Пілсудскі ўзяўся за ажыцьцяўленьне загаду консэрватыўнага ўраду Англійчыны і хоча разграміць беларускую рабоча-сялянскую Грамаду.

Але ня будзе гэтага!

Няхай ведае сусьветны фашызм, што мы рабочая моладзь наперашаму сыгналу пролетарскай дзяржавы СССР пойдзем, як адзін у шэрагі рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі, каб адбіць усякія спробы міжнароднага імпэрыялізму, і пашкодзіць мірнаму будаўніцтву соцыялізму ў нашай краіне.

Для гэтага нам комсамольцам і беспартыйнай рабочай моладзі необходна больш узмацніць нашу сувязь з Чырвонай Арміяй, узмацніць вывучаньне вайсковай справы, стаць першымі застрэльшчыкамі ваенізацыі насельніцтва і пашырыць шэрагі Таварыства Садзейнічаньня Абароне Авіяхім.

Мы выносім з абурэньнем свой гучны протест супроць ладжкаў разгулу польскага фашызму над рабочымі і сялянамі Заходняй Беларусі, якія ператварыліся ў турму. Мы шлем свае гарачае прывітаньне вязьням польскіх турм, рабочым і сялянам і рабоча-сялянскай моладзі Заходняй Беларусі. Выказваем нашу падрыхтаванасьць дапамагаць ім матар'яльна і марыльна шляхам збору сродкаў і узмацненьнем шэрагаў МОПР'у

Прэч польскі фашызм, які кіруецца англійскім імпэрыялізмам!

Няхай жыве вызваленча-рэволюцыйны рух Заходняй Беларусі!

Пілсудзкі--гэта вайна.

Выступленьне ў сойме дэпутата-комуністага Сахацкага.

З польскім сойме, у спрачках па бюджету вайсковага міністэрства комуністычны дэпутат Сахацкі заявіў: «У нас складалася пьвёрдае ўражаньне аб Пілсудскім: Пілсудзкі — гэта вайна. Спробы ажывіць пятлюраўшчыну, захады продажных здраднікаў украінскіх і беларускіх мас, скандальныя нападкі на Грамаду і яе дэпутатаў — усе гэта сьведчыць аб спробах вчысьціць поле. Комуністычная фракцыя,—закончыў Сахацкі,—відае масам лозунг: «Вайна—вайне».

Новыя расстрэлы комуністых у Літве

Расстрэлы зьявіліся для компартыі нечаканасьцю

У зьвязку з паведамленьнем аб прысудзе да кары сьмерцю, які вынесены трох літоўскім комуністам (т. т. Стражасу, Казакевічусу і Алексіўнасу) старшыня літоўскай сэкцыі Камінтэрну т. Ангарэціс паведаміў супрацоўніка ТАСС аб наступным: «Новыя прысуды да кары сьмерцю трох літоўскіх комуністаў зьяўляюцца для нас нечаканасьцю. Засуджаныя таварышы ня былі раней разам з іншымі комуністамі арыштаваны. Як відаць, прысуд зьяўляецца вынікам правакацыі з боку літоўскага ўраду».

Зацьверджаньне конфіскацый беларускіх газэт.

Гэтымі днямі віленскі акруговы суд зацьвердзіў конфіскацыю № 8-га беларускае газэты «Наша справа» за 10-е студзеня г. г. і № 2 «Народнага Звону» за 16-1-27 г.

Абедзьве газэты абвінавочаны ў якіяшчэньні вестак «процідзяржаўнага» характару.

Конфіскацыя «Сялянскае Нівы».

Апошнія два нумары «Сялянскае Нівы» сканфіскаваны поліцыяй. Гэта першая конфіскацыі ад пачатку існаваньня газэты «Сялянскага Саюзу», які быў дагэтуль вельмі пажаданым для польскае улады, накуль стараўся апалёґваць Грамаду і яе дзеячоў. Цяпер, калі ўрад сам уляўся за адкрытую барацьбу з Грамадой, «Сялянская Ніва» страціла ласку і тое, што ей раней дарэвалася, цяпер упісваецца ў яе рахунак, як беларускай газэце.

Фашызм змагаецца з беларускім культурным рухам.

15-га студзеня ў Горадні меўся адбыцца беларускі спэктакль-вечарына, наладжаная гарадзенскай акруговай управай Таварыства Беларускае школы.

Перад самым пачаткам спэктаклю ў тэатр зьявілася поліцыя і арыштавала усіх артыстаў, пратрымала іх усю ноч і толькі раніцаю звольніла.

Такія чынам гэта беларуская вечарына была сарвана пра поліцыю.

Будзем узмацняць тыл!

(На адчыненьні 3-яй Менскай акруговай конфэрэнцыі ЛКСМБ).

Актыў дванаццацітысячнай комсамольскай арміі Менчыны. Большасьць іх—анёмы паміж сабою. Мала таго, што анёмы—далегаты конфэрэнцыі—гэта пераарыўны клубок комсамольскай энэргіі, бальшавіцкай пераканаласьці ў канчатковую пролетарскую перамогу.

Шчыра апавядаюць адзін другому пра працу ў сваім раёне, радзеча дасягненьні вопытам практычных дасягненьняў у галіне гаспадарчага адбудаваньня.

Некалькі далегатаў, сярод іх тры дзяўчыны, адчуваюць сябе узбударажана: моцнае электрычнае сьвятло прымушае іх сэрцы больш сьпісвуцца, каб запасьці энэргіі і моцы для яшчэ большага асьвятленьня менскай вёскі і мястэчка. Гэта новы актыў, выхаваны на практычных перамогах у соцыялістычным будаўніцтве.

* * *

Першае слова тав. Шалімы пры адчыненьні конфэрэнцыі было аддадзена нашаму міжнароднаму становішчу, эканомічнай моцы Савецкай Беларусі, якая стаіць на рубяжы двух сьветаў, катаваньнем нашых братоў у Заходняй Беларусі.

І трэба-было толькі ўспомніць рубеж... захад... бізун пана Пілсудскага... фашысцкія тэроры, як у кожнага з прысутных кінэстужкай мільгануці ў галаве усе вялікія, ніколі пачуваныя падзеі апошніх месяцаў.

Іх не забудзе працоўная моладзь Савецкай Беларусі! Яна памятае «ласку» Пілсудскага яшчэ з 20-га году. А таму сёньня успаміна, каб на злосьць зьяўляцца ў ад ну сям'ю якая лёгка вырашыць ўсе, нават і досыць цяжкія, задачы нашай саюзнай працы.

Ад імя Акруговага Камітэту КП(б)Б вітае конфэрэнцыю тав. Лаўкоў. Ён проста заўважае аб жаданьнях Антаніі ў адносінах да Савецкага Саюзу, аб замерах англійскага найміту маршала Пілсудскага. Яго словы ўважліва слухаюцца далегатамі не для таго, каб выслухаць іх, а для таго, каб яшчэ больш спазнаць мірную, дружалюбную політыку комуністычнай партыі, каб навучыцца яшчэ больш узмацніць наш савецкі тыл. Рэч ідзе аб ваенізацыі рабоча-сялянскіх масаў.

Таварышы чырвонаармейцы, якіх часьці прысылалі для перадачы конфэрэнцыі гарачага прывітаньня просяць далегатаў прыняць усе захады да таго, каб шматтысячны рабоча-сялянскі моладзяк Менчыны «сябе мабілізаваў», быў на пагатове з гордасьцю адбіць спробы нападаў капіталістаў на пролетарскую рэспубліку.

Беспартыйная дзяўчына з гуртка кройкі і шыцьця пры Менскай ШСМ тав. Пятровіч таксама ведае, як жывецца не сёстрам у капіталістычных краінах, як прыходзіцца маткам паліваць горкімі сьлязьмі ахварбованыя сынаўскаю кроўю загоны. Таму яна сёньня заўважае конфэрэнцыі Менскай організацыі комсамолу—свайму кіраўніку—што «сёньня мы вучымся для таго, каб у патрэбны момант пайці на вайну і шыць там рубашкі для нашых байцоў».

Перапоўненая зала на такія заклікі агоньчыкамі вочаў выцісвала—будзем узмацняць наш тыл, бо тая армія перамажа, якая будзе моць адкуль чэрпаць новыя падзейныя сілы для напаўненьня іх шэрагаў!

* * *

Пасьля ўрачыстай часткі, далегатаў конфэрэнцыі павесяліў комсамольскі аркестр клюбу «КІМ» і паважаны дзядзька Галубок са сваёю трупай.

Асабліва далегатам спадабалася ігра не Галубка на гармоніку і беларускія народныя скокі.

Дэлегат З.

ВУЧЫМСЯ КРОІЦЬ І ШЫЦЬ

У Нова-Беліцкай школе навучаецца 150 работніц

У гурткох кройкі і шыцьця дзяўчаты вучацца грамаце

Практычнай і конкрэтнай працай зьнішчым хворыя погляды на дзяўчыну, павялічым процант апошніх у Саюзе

10 машын і 150 вучняў.

Школа асьвядоміла 30 дзяўчын.

Сярод дыму фабрычных труб рабочага пасёлку **Нова-Беліцы**, у клопаце штодзённага жыцьця чыста напрыкметна прывіваюцца расточкі новага рэвалюцыйнага быту, якія растуць і разрастаюцца ў цэлыя стройныя дровы.

У маленькім пакойчыку клюбу фабрыкі «**Везувий**» стройнымі шэрагамі расстаўлены 10 швейных машын. Штодзённа ў гэтым маленькім прыгожа абсталяваным пакойчыку, увабранага партретамі Леніна, Сталіна і інш. убачыш дзесяткі **два** нахіліўшыхся над машынамі жаночых галоў.

Час ад часу навучаньне працаўніц перарываецца жартамі, цікавымі слоўцамі.

У часе працы шмат бадзёрыя комсамолкі з надстрыжанымі валасамі прыціхаюць або мурыкаць песенькі ў такт стракатаньню машын.

Адных жанчын зьмяняюць другія. Так чарадуюцца усе вучні.

Гудзе першы гудок і пакойчык з машынамі напаўняецца цішынай. Адна за другою схінуўшы галавачкі матэрыі хаваюцца за вялікімі фабрычнымі дзьвярмі. Трэці гудок. Зноў пакойчык ажывае і запаўняецца пахам пралай асіны і сасны, які прынесьлі работніцы з фабрыкі запалак і лесазаводу.

Цікавы пакойчык!

Яго ведаюць 150 работніц і жонак рабочых, пра яго гавораць у многіх кватэрах рабочых Нова-Беліцы.

* * *

Пасьпяшаючы мінулага году жанадзел арганізаваў раённую Нова-Беліцкую школу **кройкі і шыцьця**. У школе займаецца 150 работніц Нова-Беліцы. Большай школы, як сёлета, няма ні ў Гомельскай акрузе ні ў суседніх ей.

Сярод 150 вучняў макаукамі вылучаюцца сваімі чырвонымі хусткамі маладых дзяўчаты-работніцы.

Большасьць з іх беспартыйныя, нядаўна прыбыўшыя на фабрыку. — «Не хацела раней ісьці ў школу, — апавядае сялянская дзяўчына, нядаўна прыехаўшая на фабрыку, думала лепш пасудзіць, куды сходзіць у вольны час, а не ісьці вучыцца шыць».

Мая таварышка Анька Жукава так праз гэту школу і ў комсамол паступіла».

І такіх Анек школа дала Комсамолу шмат. Маладыя дзяўчаты ў школе гэта крокаджы, якімі падтрымоўваецца высілась і радасьць у часе заняткаў.

Але за тое і пасьпяваюць дзяўчаты добра! Вельмі ў школе **комсамолка** Лабачова і дзве беспартыйныя дзяўчыны — Сяракалетава і Краўчанка, якіх не нахваліцца кіраўніца школы тав. Шэрбін-Лесевіч.

Нажылых жанчын, якія ў школы умелі крышку шыць — і тых выперадзілі гэтыя дзяўчаткі!

Напісьменных, побач з навучаньнем шыцьцю і красьнію навучаюць чытаць і пісаць.

Ці ў насьценную газэту напісаць, ці шыць палатно ў клюб для кіно-стужкі — дзяўчаты энергічна самі працуюць і за сабою цягнуць усю школу.

У школе праводзяцца політ-гутаркі і гутаркі пра новы быт. Маладняк прыняў не апошні ўдзел у абсьледаваньні райсавету, ясляў, якое правяла школа.

Алесь Беларус.

Работніца зав. „Красный Деревообделочник" тав. Сяракалетава. У школе кройкі і шыцьця навучылася грамаце.

Работніца фабрыкі „Везувий" тав. Краўчэнка.

Працягваць пачын.

(Зарэчча, Смалявіцкі р., Меншчына)

Каб уцягнуць дзяўчат у ячэйку, каб іх крышку загадзе асьвядоміць былі утвораны гурткі: драматычны і харовы, у якіх актыўна працуюць нашы маладыя батрачкі і сялянкі.

У ячэйку ужо запісалася 9 дзяўчын, з іх тры ня адказвай грамадзянскай і комсамольскай працы.

Трэба сьцьвердзіць, што Жлобінская ячэйка ў далейшым лічыць з большай адказнасьцю будзе дапамагаць нашай дзяўчыне выкарабкацца з цемры.

Шыем і кроім.

(Вільшчынская ячэйка ЛКСМБ. Койданаўскага раёну).

Згодна плану працы нашай ячэйцы трэба было арганізаваць гурток кройкі і шыцьця, для вясковай моладзі — дзяўчат. Пытаньне стаяла на пасяджэньні бюро ячэйкі, дзе ухвалілі: дагаварыцца з вытворчай секцыяй пры ПСМ аб арганізацыі гэтага гуртку.

Вытворчая камісія выпрацавала планы, які ўгодзіла з бюро ячэйкі. Гурток распачаў сваю працу ў сьнежні месяцы мінулага году.

На заняткі прыходзіць 45 дзяўчат з бліжэйшых трох вёсак. Гурток працуе 2 разы ў тыдзень. У якасьці кіраўнікоў працуе 2 комсамольцы-краўцы.

Дзяўчаты з посьпехам вывучаюць кройку верхняй адзежы і сподняй, навучаюцца як трэба абыходзіцца з нівэйнай машынай.

Перад заняткамі гуртка (пакуль збіраюцца ўсе дзяўчаты) сябар ячэйкі праводзіць гутаркі на розныя тэмы.

ВЯЦЧ.

СЛУХАЙ КОМСАМОЛКА!

(Наказ комсамолцы да міжнароднага дню работніц)

Правяраючы чарговы міжнародны жаночы дзень, мы можам сьвядома сказаць некаторыя дасягненьні у нашай працы сярод дзяўчат. Лічба дзяўчат у Комсамоле вырасла з 12 проц. да 2[illegible] проц. Зараз іх цэлая вялізная армія — 400000. У школы фабзавучу сталі нападаць ужо не адзінкі, а як правіла у новым наборы яму адведзены вызначаны процант і дзяўчатам. У брыгі замацоўваецца за вытворчасьцю таксама вызначаны процант дзяўчат. Прычым на вытворчасьці ў школе фабзавучу, у брыгадзе дзяўчына паказвае сябе ня горшым працаўніком, як хлапец. А вытворчасьць-жа была тым «сьвятым сьвятых», куда пушчалі дзяўчыну толькі для чорнай працы.

У нас ёсьць шмат іншых посьпехаў і дасягненьняў у працы сярод дзяўчат. Забываць аб іх нельга, но ўсе іх трэба паказаць у дзень работніцы і не у сухіх дыяграмах, справаздачах, дакладах, а паказаць жывых людзей, сваімі рукамі, якія творяць сваю дзею.

Але мы будзем гаварыць ня толькі аб посьпехах. Наша слова ня толькі аб комсамолцы, але аб не задачах. 400.000 — гэта армія.

Наша слова сёньня — да ўсяе гэтае армі, да кожнага салдата не асобна.

Помні, што па вакзалах вуліцах ходзяць дзесяткі і сотні тысяч беспрытульных. Кім яны будуць? Ці будучым пагрозе мірнага насельніцтва, пасталіцы брадзяці ці з мудрэцкаю волею, прымучаныя да сусьвітнай барацьбы будаўнікі новага жыцьця? Спрыт у вы[illegible] і дапамозе. На дапамогу можна надасьлець у час і яны будуць гарадзкімі пролетарыямі, будаўнікамі, якім прадстаўць гэроічныя справы і стварэньне цуду у вытворчасьці пры дапамозе машын і навукі.

Усе залежыць ад цябе — комсамолка ад твае энергічнай працы у камісіях па барацьбе з гэтымі недахопамі, ад твае працы у спэцыяльных атрадах, ад тваіх зборах на карысьць беспрытульных, ад твае здольнасьці расшторхаць, разбудзіць агульныя погляды, і ад твае здольнасьці пастаўіць на гэтую працу ўвесь вялізарны 2-х мільённы комсамол.

Помні далей, што наша вялікае сьвята 10-ці годзьдзя Кастрычніка засмучаецца тым, што у нас ёсьць шмат для сотка тысяч людзей, якія ня могуць прачытаць гісторыю Кастрычніка, ня умеючых зразумець нашыя радасьці, і тыя вялікія задачы, якія стаяць наперадзе. А за гэтымі цемнымі людзьмі, якія можа быць на сваёй цемнаце зьлуляюцца лютым ворагам новаму строю і цяжкасьцю на нагах гісторыі — цягнецца яшчэ больш вялікая армія — паўграматных, чуць граматных, і чытаючых па складох. І у гэтай армії больш усяго жанчын.

Няхай ад сеньняшняга дню «чырвоныя хусткі» з лемантарам і азбукай у руках зьявяцца на вясковыя пункты ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, няхай пашыцьцем для сябе лічыць кожная комсамолка працаваць у гэтай галіне, няхай усе гэта вялізная 400.000 армія, зьлучаная мощнымі энергічнымі адзінкамі — правадырамі пойдзе заўтра у бойку супроць цемнаты і несьведомасьці, арганізоўваючы роты зборчыкаў лемантара, роты агітатараў, роты навучаючых і роты, якія будуць вучыцца.

Помні ты, завязаўшы ўжо чырвоную хустачку, і маючы кніжку — білет Комсамолу, што на вялікіх прасторах нашай краіны, пераважаючая частка насельніцтва — твае сёстры па полу. Але як далекі яны ад цябе у сваім разьвіцьці, у сваім разуменьні, ад падзей, якія здбываюцца і як часта забываем мы аб іх аб масах, захапіўшыся працаю над сабою працаю у сьценах нашай арганізацыі. Гэтай частцы насельніцтва жанчыне прадстаіць адыграць вялікую ролю ў справе падняцьця і ўзмацненьня нашай краіны, у справе пасьпешнага прасоўваньня новага быту. Для гэтага больш дзяўчат у Комсамол: агітуйце, арганізуйце: завядзе сваіх сясьцер, сваіх таварышок у тую арганізацыю, дзе умеюць прымушаць працаваць ня толькі для сябе, а для усіх. Не 400.000, а мільён дзяўчат павінна быць у Саюзе.

Нарэшце наш чацьверты апошні наказ. Памятай аб сваёй працы, аб сваім месцы ў Комсамоле, аб сваіх запатрабаваньнях, аб сваіх правах. Памятай аб тым, што табе самой трэба быць арганізованай для таго, каб прыблізіцца да кіраўніцтва Саюзам, не на словах, а на справе. Помні, што табе трэба адвучыць усіх ад грубых нетаварыскіх пасьмешлівых адносін да цябе, да твае працы.

Такі наш наказ дзяўчыне-комсамолцы. Ці будзе гэта ў сьвята, ці у будзіня дні, але мы цьверда пераконаны у тое, што ўсе гэтыя задачы будуць пасьпешна рэзьвязаны нашым дзявочым актывам, што да іх будзе прыкавана увага ўсяго Саюзу. Залогам гэтага служыць усё больш растучая арганізаванасьць і актыўнасьць дзяўчыны комсамолкі.

М. З.

Распачала працу

Менская Акруговая Конфэрэнцыя ЛКСМБ.

5-га лютага к 6 гадзіне пачынае напаўняцца клюб далегатамі.

На сцене тав. Шаліма адчыняе конфэрэнцыю.

На конфэрэнцыі прысутнічае 156 чалавек з рашаючым голасам.

Абіраюцца прэзыдыум, сакрэтарыят і мандатная камісія.

Хвалій воплескаў сустракаюць далегаты абвестку тав. Шаліма аб прыбыцьці марака прадстаўніка на конфэрэнцыю ад падшэфнага лінкору «Парыская Комуна» і прапанову абраць яго ў склад прэзыдыуму.

Наказ партыі.

Менская акруговая арганізацыя ў асобе яе 3-яй конфэрэнцыі ад АК КПБ шчыра прывітаньне — вітае конфэрэнцыю т. Лянкоў.

Таварышы, Вы сабраліся на конфэрэнцыю для падвядзеньня вынікаў свае працы, а таксама для прагляду сваіх дасягненьняў і недахопаў.

Праца конфэрэнцыі павінна выхадзіць з асноўных задач КПБ. Практычная праца конфэрэнцыі павінна праходзіць пад кутом сацыялістычнага будаўніцтва нашае краіны.

Наш комсамол за мінулы год мае вялікія дасягненьні, але ён мае і свае недахопы.

Лічбы пакажуць нам гэта.

У выніку перавыбарнай кампаніі ў ЦРК у мінулым годзе, комсамольцаў было 6 проц., у гэтым годзе мы маем зьніжэньне — 5,8 проц. і гэта ў тых умовах, калі наш комсамол колькасна ўзрастае.

У вёсцы мы таксама маем рост комсамолу, але ў мінулым годзе на кіруючай кооператыўнай працы было 12 проц., а ў гэтым — абрана ўсяго 5,3 проц.

Сапастаўляючы лічбы мы бачым, што пры колькасным узросьце акруговай арганізацыі, процант удзелу ў кіруючай кооператыўнай працы зьніжаецца. Тут трэба адшукаць тыя прычыны ў зьвязку з якімі праходзіць гэтае зьніжэньне.

Вось мем таксама перавыбары сельсаветаў. У мінулым годзе ў сельсаветах было абрана 200 комсамольцаў, у гэтым годзе 199 ч. Тут таксама крокаў наперад не заўважаецца. На нашай 3 конфэрэнцыі, нам трэба намеціць тыя шляхі па якіх мы можам зьнішчыць прычыны зьніжэньня процанту нашага ўдзелу ў грамадзкай працы і вызначыць крокі ў далейшай працы.

У нас у комсамоле няма яшчэ рацыяналізацыі працы, на што трэба зьвярнуць сур'ёзную увагу. Ленінскае выхаваньне арганізацыі павінна быць асяродкам нашае працы, без якога мы ня зможам прымаць належнага ўдзелу ў нашым будаўніцтве.

Мы ў апошнія часы сачылі за разгромам Пільсудзкім Беларускай Грамады; Румынія, Літва рыхтуюцца да вайны, політыка Англіі таксама накіравана на тыя краіны, якія абкружаюць нас, яна хоча скарыстаць гэтыя краіны супроць нас. Мы бачым, што каштарыс на вайсковую справу ў імпэрыялістычных краінах узрос на 100 проц., падгатоўку нам трэба быць баяздольнымі, нам трэба пытаньне ваенізацыі паставіць на належную вышыню, і я думаю, што яно займе належнае месца на акруговай конфэрэнцыі.

Абаронім горад Леніна.

Ад лінкору «Парыская Комуна» вітае конфэрэнцыю тав. Самарын.

Таварышы! Дазвольце вітаць Вас ад імя асабовага складу лінкору «Парыская Комуна» і паднесьці Вам падарунак, зроблены самымі чырвонафлётцамі (модель мінаносцу).

Заходняя буржуазія рыхтуецца да нападу на нас, але мы кажам, што і у нас порах заўсёды сухі.

Наш Чырвоны Балтфлёт сумее заўсёды абараніць горад Леніна.

Няхай жыве сяйка комсамольцаў і флётам.

Конфэрэнцыя адаб'е нашы думкі.

Тов. Выменец вітае конфэрэнцыю ад рабочай моладзі Менскага вуалу МБВ — чыгункі. Комсамольцы і рабочая моладзь шлюць свае гарачае прывітаньне конфэрэнцыі. У галоўным наша моладзь імкнецца да вывучаньня ленінізму, да паляпшэньня эканомічнага становішча. Я спадзяюся, што 3-я акруговая конфэрэнцыя гэтыя думкі і надзеі адаб'е ў сваёй працы.

Гурток кройкі і шыцьця прысляў падарунак.

Ад беспартыйных дзяўчат Койданаўскага раёну з прывітаньнем выступае тав. Пятровіч, якая падносіць конфэрэнцыі падарунак: плякат вышыты на палатне дзяўчатамі-сябрамі гуртку кройкі і шыцьця.

Ваенізаваць менскую арганізацыю.

Ад комсамольцаў Самарскай імя Ангельскага пролетарыяту дывізіі 3-яй Менскай Акруговай конфэрэнцыі перадае гарачае прывітаньне т. Шухардзін.

Тав. Шухардзін.

Комсамольская арганізацыя дывізіі у мінулы год мае вялікія дасягненьні у сяе росту за лік прышоўшых у армію сяля, а таксама ў павялічэньні партасяродку ў арганізацыі, у галіне абучэньня чырвонаармейцаў і ўзмацненьня дысцыпліны. Наша арганізацыя заваявала вялікі аўтарытэт сярод беспартыйных чырвонаармейцаў. Наша арганізацыя добра зьвязана з Менскай арганізацыяй КСМ, асабіста з гарадзкім яе раёнам, нам трэба быць баяздольнымі, асабліва Менскай арганізацыі КСМ, якая стаіць на мяжы Савецкай і капіталістычнай краіны. Ваенізацыю нашай комсамольскай арганізацыі, патрэбна паставіць на першы плян. Комсамольцы-чырвонаармейцы даручылі мне перадаць падарунак зроблены самымі комсамольцамі. Ён уяўляе з сябе чарнільны прыбор. Але мы падносім яго не дзеля таго, каб разгадзіць больш папяровай валакіты. Зусім не. Мы жадаем, каб з яго нашым пісарам арганізацыям пісаліся дзелавыя ўказаньні.

Пасьля выступленьняў Баранавай (рабмол.) і Камолава (пагранічн.) з адказамі выступаючых і асабіста вайсковых, тов. Менская арганізацыя заўжды гатова паўтарыць гісторыю 1918—19 г. г.

Рабочай моладзі мы кажам, што акруговая конфэрэнцыя патрабуе ад яе больш працы, больш вытрымаўшыці і спайкі каб забясьпечыць пролетарскае кіраўніцтва нашай арганізацыяй.

Сялянскай моладзі мы таксама кажам, што мы заўжды стаім за паляпшэньне жыцьця сялянскай моладзі, за культурнае разьвіцьцё.

Наша конфэрэнцыя пры актыўным удзеле ўсяе рабочай моладзі будзе добра і дзелавіта працаваць пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі.

* * *

На гэтым урачыстае пасяджэньне конфэрэнцыі зачыняецца.

А заўтра 1-м пытаньнем — справаздача ЦК ЛКСМБ

Р. Г—н.

Чарговы агляд

пад шкляным калпаком конфэрэнцыі

Дзеньнік конфэрэнцыі

На пасяджэньні конфэрэнцыі у пяцьлю, 6-га лютага быў заслуханы даклад т. Баранькіна аб працы ЦК ЛКСМБ.

Даклад, спрачкі, у якіх выказалі 28 чалавек, заключнае слова заняла у ранешнае і вячорняе пасяджэньні.

У панядзелак, 7 лютага была заслухана справаздача тав. Шаліма аб працы АК ЛКСМБ і сакладзе Акр. бюро ЦК ЛКСМБ Ільліна. Вячорняе пасяджэньне пайшло спрачкі па закладам АК ЛКСМБ. Для выступленьня у спрачках запісалася 75 чалавек.

ПЕРАВЫБАРЫ СЕЛЬСАВЕТАЎ.

Дзе комсамольскія ячэйкі праводзяць вялікую працу, там комсамольцаў выбіраюць у саветы.

Комсамольцы--добрыя сельсаветчыкі

(Лагойскі раён. Меншчына)

Лагойская комсамольская організацыя гэтым годам прыняла самы актыўны, самы шчыры ўдзел у правядзеньні, як правядзячай, так і перавыбарчай кампаніі.

Падрыхтоўка да перавыбараў

праводзілася пры самым непасрэдным удзеле ўсяе організацыі.

Узяць хоць-бы Лагойскі мест.-савет. Тут комсамольцы саставілі і сьпісы выбаршчыкаў, выпісалі ўсе позвы і раздалі іх выбаршчыкам.

Праўда, былі тут і недарэчнасьці, як напрыклад: комсамолец з м. Лагойск пасоў па хутарох саставляць сьпісы, а сакр ня даў свайго сябра у дапамогу яму апошні, на ведаючы добра ўсіх насельніцтва у даным пучастку, ня ўсіх паіцаў. У выніку позвы ўсім ня былі пасланы і першая сходка гэтага пучастку (Горанаўскага) была сарвана. Але тут вінна не комсамольца, а савету. Сельсавецкая камісія ў гэтым савеце правяла ўсю падрыхтоўчую працу праз комсамольцаў.

Удзел у саміх выбарах

прынялі усе 100 проц. комсамольцаў. На выбарах у шмат якіх мясцох комсамольцы мелі досыць добры ўплыў, як напрыклад: в. Дашкі ўсе прысутныя сяляне ўмесна з комсамольцамі нават сьпявалі Маладую гвардыю».

Хаця комсамольцамі загадзе і абгаварваліся кандыдатуры, але ад імя комсамольскіх організацый сходам кандыдатуры не прапанаваліся, а выстаўляліся індывідуальна.

Амаль усюды выстаўленныя кандыдатуры комсамольцаў праходзілі (Слабоцкі сельсавет) цалком.

Аўторытэт Комсамолу падняўся

Насельніцтва глядзіць на комсамол, як запраўднага дапаможку партыі.

Калі у в. Гасьцілавічы была выстаўлена кандыдатура комсамольца і комсамолкі, дык комсамолец быў абраны у сельсавет без усялякіх перачаньняў, а комсамолкі ў парзасядацелі мужчыны не хацелі абіраць, што жанчына, а жанчыны сказалі: —нам комсамолку трэба выбраць абавязкова, бо толькі яна будзе правідлова у судзе абараняць жанчын!

У в. Мачужычы на сходзе беднаты ўсу высунут у сябры сельсавету комсамолец 16 год і калі сталі прадстаўнікі ЦК казаць, што ён ня мае права быць абраны бо ня мае 18 год, дык не хацелі нічэго з гэтым згадзіцца і казалі—комсамольца нам трэба выбраць.

Гэтыя два прыклады, узятыя з шматлікіх, ужо досыць кажуць за пагляд насельніцтва на комсамол.

Дакладчык:—За мінулы год сельсавет атрымаў заяў аб землеупарадкаваньні 127, аб утварэньні с.-г. колектываў 94...

Голас з публікі: — А колькі весак землеупарадкавана?

— Сельсавет такіх весак ня мае.

У саветы абрана комсамольцаў

Летась было па раёну 14 асоб, а сёлета абрана 19 сяброў і 4 кандыдаты.

Павялічэньне—на 36 проц. Летась старшынь-комсамольцаў быў 1, сакратароў 2, а сёлета тры старшыні і 6 сакратароў (усіх сельсаветаў у раёне 10).

У Гаенскім сельсавеце і Лагойскім мястэчковым савеце—комсамольскія прэзыдыумы.

Комсамольцы і старшыня і сакратар. У Гаенскім сельсавеце амаль палавіна сяброў сельсавету комсамольцы (5 чалавек, а ўсіх сяброў с. с. 11).

Горш справа гэта у Кораньскім і Калачоўскім сельсаветах, дзе пявыбралі ніводнага комсамольца. Гэта тлумачыцца тым, што ячэйкі тут слабыя, не вядуць сярод сялянства працы і, натуральна, сяляне не адчуваюць і комсамолу і не выбіраюць комсамольцаў у сябры сельсавету бо апошнія ня маюць аўторытэту.

Калі параўнаць процантныя суадносіны к усім сябрам сельсавету абраных комсамольцаў, дык убачым, што летась было 10,7 проц., а сёлета больш 18 проц.

Трэба надзецца, што абраныя комсамольцы сябе апраўдаюць, як комсамольцы, а комсамольская організацыя к будучаму году выхавае яшчэ больш новых комсамольцаў-сельсаветчыкаў.

Я. Жручонак.

На перавыбарах

Пазбавімся ад гнільля

Дзе беднота прыціскаецца.

(Андросаўшчына, Веляшынскі сельсавет, Капыльскі р.).

На выбарах нашага сельсавету прысутнічала толькі палова выбіральнікаў. Жанчын было зусім мала—толькі 4. Батракі на сход ня прышлі. Гэта тлумачыцца, напершае, цёмнасьцю і забітасьцю нашага батрака, падругое—слабасьцю комсамольскай працы сярод батрацкай моладзі і патрацяму—ня скліканіся сходы беднаты.

Кандыдатуры, што высоўваліся ў новы сельсавет—не абгаварваліся. Выбаршчыкі казалі «мы іх ведаем».

Дзякуючы гэтаму ў новы сельсавет прышлі усе серадняцкі і толькі адзін комсамолец.

КУМ.

Мы ўзрасьлі.

(Халопеніцкі раён, Барысаўшчына)

Розьнічы параўнаньне паміж перавыбарамі с-савету сёлетняга году і мінулага, дык убачым вельмі цікавы малюнкі.

У гэтым годзе на Халопеніцкаму раёну выбрана комсамольцаў у саветы 39 чалавек, з іх 29 сябрамі, а астатнія кандыдатамі і у розьнічную камісію.

Летась было 20 чал. а сябрамі толькі 7. Таксама летась ня было ніводнага комсамольца старшынёю сельсавету у гэтым годзе маем 2 комсамольцаў, выбраных старшынямі сельсаветаў, (Грыцкавічы і Латыгалічы).

Есьць і некалькі комсамольцаў, якія выбраны старшынямі розьнічных камісій.

Ніводнага прашлу комсамольцаў на перавыбарах ня было. Усе выстаўленыя кандыдатуры комсамольцаў праходзілі адпагалосна, ніякіх выступленьняў «проціў» з боку насельніцтва не прыкмячалася.

М. Дрэйцар.

Як хто падымае вытворчасьць?

Комсамольцы заводу ім. Леніна клаліся спаць у часе працы.

Дзякуючы падтрыманьня моладзьдзю новаўвядзеньняў на заводзе „Везувій" атрымана вялікая эканомія па сырцу і сродках.

Замацаваліся, павысілі кваліфікацыю.

(Нова-Беліца, Гомельшчына)

Ня так даўно у нас на прадпрыемстве рабочая моладзь падтрымала прапанову отве слова комсамолец ці малады рабочы адміністрацыі заводу і у выніку атрымалі вялікую эканомію на сырцу і сродках.

Так паступова рабочая моладзь уцягваецца ў вытворчае жыцьцё прадпрыемства.

А. Б.

Падымае вытворчасьць---у... піўной.

(Фабрыка «Звезда» Мазыршчына).

Вытворчая дысцыпліна сярод моладзі нашай фабрыкі паставлена слаба. Есьць выпадкі калі дарослыя рабочыя нецадуюць на моладзь за нядбайныя адносіны да працы.

Наведваньне вытворчых нарад ня толькі беспартыйнай моладзьдзю, але і комсамольцамі вельмі дрэннае. Нават сам прадстаўнік ад моладзі ў той час, як працуе нарада сядзіць у піўнушцы і п'е гаралку. Бюро комсамольскай ячэйкі аб усім гэтым добра ведае, але нічога не прадпрымае для выжыцьця такіх зьявішч, а іх выжыць—неабходна.

Комсамолец.

У нас, на заводзе.

(Нова-Беліца, «Красный Деревообделочник»)

У заводскай сталоўцы душна і цесна,—гэта сабраліся рабочыя другой зьмены.

Старыя паміж сабою размаўляюць аб спецадзежы і аб прыбаўцы. Моладзь тутжа гутарыць аб павышэньні кваліфікацыі, аб варштатах, фізкультуры і аб іншых цікавых пытаньнях.

Раптам сярод гомону урываецца гул сірэны, прымушаючы рабочых да свае працы.

Па ўсіх кутках заводскага корпусу расходзяцца рабочыя да сваіх варштатаў. Работа на заводзе цяжкая і брудная: організацыі пры любым марозе прыходзіцца чапляць крукам калоды, якія на версе рожуцца на пласты. Работніцы адносяць пласты ў належнае месца. Гэтая работа дасама цяжкая і жанчыны скардзяцца, кажучы «вось-бы яе выконваць мужчынам, а то нам завельмі цяжка».

У бачарным цаху работа не лягчайшая. Там усе кваліфікаваныя рабочыя працуюць зьдзельна. Вось скардзіцца адборшчыца, якая першы раз адбірае ад бараабану «сягоняя з мяне вёдзер 10 поту вылілася ад хуткай працы».

— Але і на зьдельшчыкаў злазацца ня прыходзіцца, бо і ў іх работа ня лёгкая.—Так гавораць старыя адборшчыцы. Праменьні сьвятла падаюць на маладыя потныя твары фугаўшчыкаў, якія афарбляюць клёпку.

Але ня гледзячы на цяжкую працу адчуваецца бадзёрасьць і весёласьць, адчуваецца здзіная сям'я, адзін другому стараюцца дапамагчы. Так, напрыклад, фугаўшчыкі ў вольную хвіліну абучаюць сваіх падручных фугаваць, якія з вялікай ахвотай вынучаюць гатую працу. Маецца каля 10 чалавек, у тым ліку і дзяўчат, якія умеюць працаваць на машынах.

Вось 18-цігодні Андруша працуе на цыркулярцы, і не адстае ад суседа, дарослага. Ён стараецца выканаць сваю працу як належыць добра.

Вось працаўніца Фаня вучыцца рэзаць на фугаўцы.

І так усюды намнажаецца веды ў маладых рабочых дзеля таго, каб у патрэбную хвіліну замяніць свайго майстра.

Сыпкін.

Раней „абы з рук", а цяпер...

(Гомель, Голоўныя Майстэрні, школа ФЗВ)

Да гэтага часу ў працы вучняў ФЗВ быў той недахоп, што пры прыёме працы інструктары больш звярталі увагу на надворны выгляд і на правільнае выкананьне, чым на яго разьмер. Атрымоўвалася такое зьявішча, што больш сумленныя вучні прытрымоўваліся рысунку і разьмеру, а менш сумленныя спускалі «абы з рук».

Цяпер уведзена строгае абсьледаваньне праверка рэчы, як з боку надворнай апрацоўкі так і ў адносінах разьмераў па рысунку. Гэта дае тое, што фабзавучні прывыкае працаваць па рысунку і выконваць працу точна.

Гэтым-жа мы падымаем якасьць продукцыі.

Сідорук.

Клаліся спаць у часе працы.

(Нова-Барысаў, завод імя Леніна)

На комсамольскім сходзе 28 студзеня, дзе прысутнічала і ўся беспартыйная моладзь нашага заводу быў зроблены упраўляючым заводам даклад аб задачах моладзі на прадпрыемстве. У гэтым дакладзе ня указаў, што сярод нашай моладзі есьць яшчэ дрэнныя, несьвядомыя адносіны да сваёй працы.

Бывалі, нават, выпадкі, калі комсамольцы клаліся спаць у часе працы ў начную зьмену.

Недахопам зьяўляецца яшчэ і тое, што ня усе комсамольцы прымаюць удзел у працы вытворчых нарад. Ячэйка вылучыла аднаго хлапца ў вытворчую камісію і больш нічога.

Усе спрэчкі на гэтаму пытаньню зыходзілі да аднаго, што:

У далейшым ня ўсе гэтыя недахопы трэба зьвярнуць асаблівую увагу і іх абавязкова зьнішчыць.

М. Кролік.

Чаму нам трэба зьнізіць цены.

Вось ужо больш чым за паўгода, як Савецкая ўлада і партыя вядуць упарты барацьбу за зьніжэньне цэн на спатрэбныя розьнічныя тавары, галоўным чынам, прамысловасьцю.

Ня гледзячы на даволі значны тэрмін і на вялікія стараньні, якія укладваюцца ў гэтую справу посьпехі усё яшчэ малазначны. Кампанія яшчэ ніяшаўнена, зараз заслугоўвае асаблівае вялікай увагі. На задачы зьніжэньня цэн зьвяртаецца ў сучасны момант усеагульная ўвага.

Чаму Савецкая ўлада і комуністычная партыя так настойна працуюць над гэтай справай, чаму мы як бы там ня было дабіваемся зьніжэньня цэн і зьвяртаем з гэтаю задачаю ўсе іншыя гаспадарчыя пытаньні.

Справа ў тым, што ў нас у Рабоча-Сялянскім Саюзе, палітыка цэн адыгрывае першую ролю. Гэта зброя, пры дапамозе якой мы зможам правільна забясьпечыць інтарэсы рабочае клясы і сялян. Цэны ў нас рэгулююць усю нашу гаспадарку.

У руках нашай дзяржавы згуртавана ўся галоўная прамысловасьць.

Буйны і сярэдні гандаль таксама знаходзіцца над ведамі дзяржавы і кооперацыі. Такім чынам дае магчымасьць дзяржаве [illegible] ць тавар з фабрыкі якасьці лепшай і прадаваць яго па найбольш дзяшовай цане. Вось у гэтым і це раважнасьць планавай социялістычнай гаспадаркі.

Чаму-ж у нас і якасьцю тавар кульгае і цана высокая?

Тут мы і сустракаем шэраг супярэчнасьцяй.

Напершае, у нас кульгае тэхніка. Нам патрэбны новыя машыны і абсталяваньне, у нас недастаткова кваліфікаваны рабочы склад, у нас, нарэшце не хапае сырцу, (мала бавоўны, шэрсьці, скуры і г. д.). У дадатак усяго мы маем вялікае «упраўленьне», часта на вылёт казённае, бюрократычнае і чыноўнічаскае.

Падругое, у нас кульгае гандлёвая сыстэма. Многа лішніх служачых, многа лішніх рук, праз якія праходзіць тавар. Кепска пастаўлена перавозка і водпуск тавару. Мы не навучыліся яшчэ добра гандляваць.

Як мы бачым, у нас частка прычын такога характару, якія мы можам і павінны зьнішчыць не адкладваючы на доўгі час. Гэта ў першую чаргу кепскае гаспадараньне, бюрократызм, высокія накладныя выдаткі. Адначасова, відома, усе нашы стараньні павінны быць накіраваны на падняцьце тэхнікі, на павялічэньне здабычы сырцу, на рацыяналізацыю ўсіх бакоў гаспадаркі. Лёзунг індустрыялізацыі зьмяшчае ўсе гэтыя задачы.

Такім чынам барацьба за зьніжэньне цэн есьць адначасова барацьба падняцьця гаспадаркі ў цэлым, есьць барацьба з бюрократызмам, есьць барацьба з адсталасьцю, з нізкай вытворчасьцю ў працы і г. д. Але гэта яшчэ ня ўсё. Зьніжэньне цэн вызначае таксама рэальнае павышэньне заработку рабочага, служачага. Гэта самы ближэйшы вынік, які павінен адчуваць кожны працаўнік.

Вось якую шырокую праграму задач абдымае пытаньне аб зьніжэньні цэн. І вось чаму яно стаіць зараз у аснроднку ўсяе нашай увагі. Трэба дабавіць яшчэ, што ў апошні час назіраецца нараджэнне розьніца паміж цэнамі на сельскагаспадарчыя продукты і цэнамі на фабрычныя тавары. Гэта б'е па змычцы з вёскай. Гэта б'е па сельскай гаспадарцы.

Уся ўвага павінна быць накіравана на памяншэньне гэтага расходжаньня ў цэнах. Розьнічныя цэны на прамысловыя тавары павінны быць, як бы там ня было, зьніжаны. І гэтае зьніжэньне павінны адчуваць на справе ў сялянскай спажывецкай краме.

Барацьба за зьніжэньне цэн найвялікшая задача ўсёй грамадзкасьці, усяго насельніцтва. Профсаюзы і Комсамол павінны быць у першых шэрагах на фронце гэтай барацьбы.

Усебеларускі зьезд МОПР'у.

Усебеларускі зьезд МОПР'у скліканецца ў Менску ў красавіку месяцы г. г.

* * *

Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР распачаў выданьне шэрагу популярных і тонкіх кніжак аб працы і задачах МОПР'у. Ужо выйшлі з друку 2 кніжкі, цаною па 2 кап. кожная.

Пэдтэхнікумы беларусізаваны.

Наркамасьветы правёў беларусізацыю ў 9 пэдтэхнікумах БССР амаль на ўсе 100 проц.

Горш абстаіць справа ў Гомельшчыне, дзе выкладаньне нават у Белпадтэхнікуме вядзецца па некаторым прадметам на расійскай мове.

Чарговая задача Наркамасьветы—паглыбіць беларусізацыю ў пэдтэхнікумах.

Сярод пісьменьнікаў.

«Маладняк».

Выйшаў з друку першы нумар часопісі «Маладняк» за студзень г. г.

Новым сэкратаром ЦБ «Маладняка» назначан тав. Сташэўскі.

«Узвышша».

Здадзен у друк першы нумар часопісі літаратурнага аб'яднаньня «Узвышша» пад такой-жа назвай. Першы нумар выйдзе ў другой палове лютага і будзе выдавацца рэгулярна 1 раз у два месяцы.

У хуткім часе «Узвышша» пачне выданьне сваёй бібліятэчкі прыгожага пісьменства. Ужо здадзены ў Выдавецтва збор кнігі наступных сяброў аб'яднаньня: З. Бядулі, Я. Пушчы і Кранівы.

З сакавіка месяцу гэтага году «Узвышша» будзе наладжваць літаратурна-мастацкія вечары.

У тры радкі.

▣ Дзеля паленшаньня бібліятэчнае справы Інбелкульт прыступіў да досьледу літаратурных запросаў вучнеўскай моладзі.

▣ На карысьць палітвязьняў Польшчы артысты Белар. Дзярж. Тэатру ахвяравалі ЦК МОПР'у БССР—550 руб.

▣ ЦБ Пралетстуд хадайнічае перад Белкаапсаюзам аб распаўсюджваньні кааперацыйнага крэдыту ў 1-ю чаргу на студэнтаў-стыпэндыятаў.

▣ У Доме Чырвонай Арміі адчынена выстаўка матар'ялаў да гадавіны Ч. Арміі.

ВАША ЯЧЭЙКА ДРЭННАЯ!

Яна ня прымала належных захадаў да закупкі білетаў на агульнадаступныя спэктаклі для моладзі, організаваныя „Чырвонай Зьменай".

Яшчэ ня позна справіць памылку!

Білеты на спэктаклі (ад 15 да 75 кап.) кожны вечар прадаюцца ў клюбе „КІМ" у тав. Ароцкера.

Менская Комсамолія, пасьпяшайся купіць білеты!

„Мяжа".

(У вышэйшым судзе).

«Мяжа»—гэта ціхі пасёлак, закінуты у адным з глухіх куткоў Віцебскай акругі. Некалькі сямей малаземельных сялян апрацоўвалі старэнна і дружна гэты кавалак зямлі. Пасёлак праквітаў. Зьявілася і кузьня свая і некалькі сельска-гаспадарчых машын.

Так было да 1926 году, пакуль не ўзьніклі розныя супярэчнасьці сярод жыхароў пасёлку. Стала не хапаць зямлі. Насельніцтва ўзрасло да 12 сямей.

— Што рабіць? Выхад адзін—перасяленьне.

У хуткім часе была створана спэцыяльная камісія па перасяленьню. У склад яе ўвашлі ад жыхароў пасёлку: Д. Шкрадаў, Г. Харлапенка і І. Паўлючэнка.

Яны ўнесьлі прапанову, каб з пасёлку выселіць больш хуліганскі элемэнт. Паўлючэнка нават настаяў на тым, каб выселіць яго ўласнага сына Антося, які у апошнія часы вельмі п'янстваваў і хуліганіў.

Антось даведаўшыся аб гэтым, пешта задумаў.

У ліпні, сьвяточным днем Антось з сваім прыяцелем Трахімам Загнетам, падвыпіўшы, пашоў прагуляцца на ваколіцу...

Было ўжо позна, калі 2 калегі спаткалі старога Паўлючэнка. Ня доўга думаючы, яны накінуліся на яго.

Калі сонныя сяляне, ускінуўшыя на сьнех сьнітні, прыбеглі на ваколіцу, яны убачылі, што стары Паўлючэнка быў забіты.

Віцебскі акруговы суд прыгаварыў Антося Паўлючэнка і Трахіма Загнета да 9 гох турэмнага зьняволеньня кожнага.

Вышэйшы суд прыгавор зацьвердзіў.

Вій.

НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ.

Што чытаць да дню Чырвонай арміі

23-га лютага Чырвоная армія сьвяткуе 9-ю гадавіну свайго існаваньня.

У нашы дні, калі на кругавідзе зноў згушчаюцца хмары, ні адзін грамадзянін СССР, а комуніст і комсамолец тым болей, ня можа застацца бязудольным да жыцьця Чырвонай арміі. Стары лозунг «Калі жадаеш міру рыхтуйся да вайны»—застаецца верным і для нас.

Абарона краіны—справа ня толькі арміі, але і ўсяго насельніцтва. Армія на шя невялікая, але не падтрымлівае ўзброены народ. Кожны грамадзянін павінен умець страляць і ведаць свае месца і свае абавязкі, калі гране гром вайны.

* * *

Перш за ўсё трэба ведаць, што думаў і якія задачы ставіў перад Чырвонай арміяй яе першы і бясьсьмертны арганізатар Уладзімер Ільіч Ленін. Ленін усяго прачытаць яго ўласныя артыкулы ў зборніку: Ленін. «Армія і рэвалюцыя» (Гвиз, 180 стр. Ц. 35 к.) ці ў кніжцы М. Фрунзе «Ленін і Чырвоная армія» (Гвиз, 1925 г. Ц. 50 к.), Абодвы гэтыя кнігі разьлічаны на падрыхтаванага чытача, а для пізавога чытача іх заменіць популярная кніжка Я. Броніна «Ленін і Чырвоная армія» (Гвиз, 1925 г., 56 стр. Ц. 15 к.).

З утварэньнем, гісторыяй і разьвіцьцем Чырвонай Арміі, ад атрадаў чырвонагвардзейцаў і да апошняй рэорганізацыі яе, пазнаёміць нас кніга В. Таля «Гісторыя Чырвонай Арміі» (Гвиз. 1925 г., 208 стр., ц. 90 к.). Для менш падрыхтаваных раім кніжку С. Вацоова «Ад Чырвонай гвардыі да ўзброенага народу» («Молодая гвардия», 56 стр., ц. 50 к.).

Вельмі важна быць добра знаёмым з унутраным пабудаваньнем Чырвонай Арміі і нашай тэрыторыяльна-міліцыённай сыстэмай. Тут есьць шэраг даступных кніг: І. Аляксеў «Тэрыторыяльныя фарміраваньні» (Гвиз, 1926 г., 118 стар., ц. 50 к.) і яшчэ больш даступная—А. Гродка. «Тэрыторыяльная Чырвоная Армія і абарона СССР (Гвиз. 1925 г., ц. 50 к.)

Да значэньнем Чырвонай Арміі ў перыод дыктатуры пролетарыяту знаёмяць таксама невялічкія кніжкі: Шышоў «Чаму патрэбна Чырвоная Армія» (Гвиз, 25 г., ц. 5 к.), А. Гродка «Ці дарма трацілі селяніп час на службе ў Чырвонай Арміі (Гвиз, 62 стар., ц. 12 к.), А. Кадзішаў «Што павінен ведаць малады чырвонармеец (Гвиз, 24 г.), Мастаненка «Дапрызыўная падрыхтоўка» (Гвиз, 25 г., ц. 5 к.).

Адзначым яшчэ адну кніжку: К. Падсоцкі «Вучоба і быт Чырвонай Арміі («Мол. Гвардия», 24 г., 48 стар., ц. 20 к.).

Для правядзеньня дню 23-га лютага у вясковай ячэйцы раім зборнік для хатчытальняў пад рэдакцыяй **Е. Аржэкаева** «Дзень Чырвонай Арміі (ГВИЗ, 128 стар. Ц. 1 руб.).

Вельмі пажадана прыурочыць да гэтага дню адчыненьне ваеннага куткa, які павінен быць у кожным комсамольскім клюбе. Тут дапаможа кніжка **В. Камскага і В. Каробачкіна** «Ваенны куток (ГВИЗ, 25 г., 118 стар., Ц. 60 к.).

Нарэшце пакажам на кніжкі, якія ясьвятляюць узаемадносіны Чырвонай арміі з комсамолам. Аб гэтым апавядаюць кніжкі **М. Рафэса** «Чырвоная Армія і Комсамол» («Мол. Гв.», 25 г., 64 стар., Ц. 25 к.); **К. Рачкоўскага** «Комсамол у Чырвонай арміі і Чырвоным флеце» (Гвиз, 35 стар. Ц. 15 к.) і **Ф. Пажыткава** «Ваенная праца комсамолу у вёсцы» («Мол. Гв.» 26 г., 32 стар. Ц. 12 к.).

Асабліва рэкомэндуем зборнік пад рэдакцыяй **А. Курціка** «Линкор Парыская Комуна», які гэтымі днямі выйдзе з друку (Выдавецтва «Чырвоная Зьмена»).

Шпацыя

Вясёлыя радкі.

«Запамятаў»...

Тых. сакратар звярнуўся да адк нага сакратара:

— Ты запамятаў напісаць, тав рыш сакратар!

— Зноў надпісаць?!

— Так, але на гэты раз **падпіса на на Чырвоную Зьмену**.

Беларуская мова.

(У школе).

— Бараноўскі, што такое жары?

— Зьніжэньне цэн.

Цяжкая неабходнасьць.

— Паслухай, ці няма ў цябе на пр кнеце бухгальтэра добрага?

— Нашто табе? У цябе і адному няма чаго рабіць!

— Што-ж я магу рабіць, калі штату належыць?!

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Суд над... музыкай.

У пятніцу 11 лютага, а 8 гадзі ўвечары, у памяшканьні клубу КІМ а будзецца суд над музыкай, організаваны юнсэкцыяй Дому Працасьветы.

У якасьці абвінавайцы і абаронцы пр праваны вядомыя спэцыялістыя па муз цы проф. Дрэйзін (музтэхнікум) і Та (БДУ).

У якасьці сьведак могуць выступ усе жадаючыя.

Білеты у клюбе КІМ.

Згублены.

— Сябр- білет ЛКСМБ на імя К туша, выд. Менакруткомам за № 8467

— Час пасьведчаньне № 27 на Э. Галубка, выд Менакруткомам.

Адказныя рэдактары: А. ВАРАНЬНІКА, Д. КУРЦІК.

Салют старэйшым братом.

Піонэрская дэмонстрацыя ў Менску.

12-ая гадзіна дню.

Піонэрскія атрады гораду Менску зьбіраюцца каля сваіх райкомаў.

Весела.

Цепляе надвор'е і сьнег бадзяраць іх.

Яны ідуць, каб пачыра прывітаць старэйшых братоў-делегатаў 3-й акруговай конфэрэнцыі ЛКСМБ.

Пасьля кароценькага мітынгу на Плошчы Волі піонэрская дэмонстрацыя накіроўваецца да клюбу КІМ, у якім адбываецца конфэрэнцыя.

Мільгаюць маленькія галоўкі, паднятыя рукі, чырвоныя сьцягі.

Ві-та-ем ста-рэй-шых бра-тоў!—носіцца навакол.

У гадзіны 3 дню піонэрскія атрады рассасаліся па вуліцам Менску.

В. К-кі.

МІНАНОСЕЦ У СКРЫНЦЫ.

(З Менскай акруговай конфэрэнцыі ЛКСМБ)

Балтыка ў зімняй сьпячцы...

Ля шэрагі граніту Кронштацкай Набэражнай стаяць закаваныя ў лёд гіганты—караблі.

Тав. Самарын.

Сярод лесу мачтаў, у мутнай дымцы Кронштацкай прыстані, быццам зачарованы стаіць падшэфны Беларускаму Комсамолу лінкор «Парыская Комуна».

Глыбокай марской восеньню лінкор апошні раз моцна дыхнуў кавалкамі чорнага дыму. Пранізваюча ўскрыкнула сірэна і замер гук яе недзе далёка ў прасторы заліўных хваль...

Лінкор стаў на зімовы рэмонт. Жыцьцё на караблі шыпіо менш бурным тэмпам. Сумявата крыху. Шэфская сувязь таксама слабавата.

* * *

Мінаносец у скрынку папаў нечакана.

З далёкай Беларусі ад шэфаў прыйшла вестка:

— «5-га лютага склікаецца Менская акруговая конфэрэнцыя Комсамолу»...

І тагды у мараком зьявілася думка—паслаць шэфам нешта небудзь такое марское...

Але што?!

— Давайце пашлем мінаносец у мініатюры!.. Модэль «Леніна»!..

— Але дзе узяць яго?.. Мінаносец?..

— Набудуем...

Карабель будавалі незвычайным спосабам. Толькі 4 дні. І не у карабельных верфях і стапелях а ў трумнай майстэрні.

4 дні ішла праца. Матросы 12-га кубрыка прымацаванага да Менскай організацыі долатамі выразвалі корпус мінаносца. Выстругвалі гарматы. З сьвінцу змайстравалі 2 шлюпкі. Паставілі мачты. З суровай матроскай ніткі зрабілі радыё.

Мінаносец гатоў. І прыгожы-ж у яго выгляд! Дасканальны адбітак з мінаносца «Ленін».

Матросы любоўна абгледзелі свой твор. Уздыхнулі крыху:

— Паламаюць яго нашы шэфы... Ня умеюць яны шанаваць такіх рэчаў!..

Мінаносец запаковалі у фанэрную скрынку, ўручылі ў рукі матросу Самарыну, з наказам, каб мінаносец быў дастаўлен на месца «целым и невредимым».

* * *

5-га лютага пасьля «доўгага плаваньня» з Кронштадту ў Менск—мінаносец апынуўся ў нечаканым райдзе: на чырвоным сукне стала прэзыдыуму Менскай акруговай комсамольскай конфэрэнцыі.

Самарын чытаў конфэрэнцыі:

Мінаносец «Ленін», модэль якога была паднесена Менскай акр. конфэрэнцыі.

— Мы, маладое пакаленьне, якое зыходзіцца ў Чырвонай Арміі і Флёце, ведаем, што на наша мірнае будаўніцтва мае замер працягнуць сваю лапу міравая буржуазія... Але мы павінны сказаць, што ў нашых склянцых порах заўсёды сухі!!!

Мінаносец быццам у падмацаваньне гэтых слоў паблісківаў мініацюрнымі гарматамі.

Грымела комсамольская «ура».

Мінаносец, трэба думаць, ня будзе зьнявожаны і паламаны. Ён будзе у нашае.

Кавалі

Чытай, выпісвай, распаўсюджвай

Нямысьлім той комсамолец, які ня чытае «Чырвоную Зьмену».

Усе маладыя рабочыя і сялянне чытаюць «Чырвоную Зьмену».

адзіную ў Беларусі масавую газэту рабоча-сялянскай моладзі

„ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА"

(Орган Цэнтральнага Камітэту ЛКСМБ)

Газэта выходзіць 3 разы ў тыдзень:

У СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ

Газэта выходзіць з дадаткамі!

З 1-га сакавіка 1927 г. «Чырвоная Зьмена» выходзіць с наступнымі платнымі дадаткамі:

„МАЛАДНЯК" (штомесячная літаратурна-мастацкая часопісь),

„ПЛУГ" (штомесячная сельска-гаспадарчая часопісь),

„ЮНЫЙ КОММУНИСТ" (двухтыднёвая ідэйна-тэарэтычна-палітычная часопісь ЦК УсеЛКСМ),

„СМЕНА" (двухтыднёвая масавая літаратурна-мастацкая і грамадзка-бытавая часопісь рабочай моладзі на рас. мове),

„ЖУРНАЛ КРЕСТЬЯНСКОЙ МОЛОДЕЖИ"

(двухтыднёвая часопісь сялянскай моладзі на рас. мове).

Памятуй умовы падпіскі:

НАЗВА ВЫДАНЬНЯЎ.	Падпісная цана					
	На 1 м-ц.		На 3 м-цы.		На 6 м-цаў.	
	Руб.	Кап.	Руб.	Кап.	Руб.	Кап.
«Чырвоная Зьмена» без дадатку	—	25	—	75	1	50
Трэба дадаткова дакладваць да падпіснай цаны на «Чыр. Зьмену» за:						
«Маладняк»	—	35	1	5	2	10
«Плуг»	—	10	—	30	—	60
«Юный коммунист»	—	50	1	50	3	—
«Смена»	—	28	—	84	1	68
«Журнал крестьянской молодежи»	—	25	—	75	1	50

Гарантыруецца акуратная дасылка выданьняў ва ўсе гарады і вёскі пры ўмове, калі падпішчык дасьць дасканалы і пабрабязны адрас і своечасова здасьць падпіску.

Падпіска прымаецца: канторай газ. «Звезда» (Менск, Савецкая 63) і ня упаўнаважанымі, ячэйковымі упаўнаважанымі на друку, усімі аддзяленьнямі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва, усімі пантова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і упаўнаважанымі Выдавецтва ЦК ЛКСМБ «Чырвоная Зьмена».

Выдавецтва «Чырвоная Зьмена».

Галоўлітоўл № 23968 Друкарня БДВ.